# БЕЛАРУСЬ У ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРАТЫЎ І ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ПАДЫХОДЫ

**У. В. Здановіч**

## ЧАСОПІСНЫЯ РЭЦЭНЗІІ НА НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ЯК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ КРЫНІЦА

Гэты артыкул прысвечаны аналізу адной з важнейшых формаў сучаснай навуковай экспертызы – часопісным рэцэнзіям на кнігі, якія ўваходзяць у асобную групу гістарыяграфічных крыніц і валодаюць пэўнай спецыфікай у параўнанні з іншымі формамі экспертызы. Так, рэцэнзаванне манаграфій мае постпублікацыйны характар і рэалізуецца ў форме публічнага выказвання. У сувязі з тым, што яно непасрэдна не звязана з працэдурамі прысваення навуковых ступеняў, таму менш фармалізавана. Рэцэнзіі адлюстроўваюць працэс фармавання новых даследчых падыходаў па дадзенай праблематыцы і дазваляюць выявіць дыскусійныя пытанні. Нарэшце, рэцэнзія часта становіцца адпраўной кропкай навуковай дыскусіі – у першую чаргу тады, калі аўтары прадстаўляюць водгукі ў адказ на крытычныя рэцэнзіі альбо пры арганізацыі спецыяльнага публічнага абмеркавання значных кніг.

Неабходна адзначыць, што паняцце “гістарыяграфічная крыніца” не мае адназначнай трактоўкі яе зместу. На думку А. І. Зевелева, “…гістарыяграфічнымі крыніцамі з’яўляюцца тыя гістарычныя крыніцы, якія вызначаюцца прадметам гістарыяграфіі і нясуць інфармацыю пра працэсы, што працякаюць у гістарычнай навуцы і ва ўмовах яе функцыянавання. Яны выкарыстоўваюцца побач з гістарыяграфічным фактам для ўстанаўлення заканамернасцей узнікнення і развіцця гістарыяграфіі” [1]. Падтрымаў А. І. Зевелеў і тых даследчыкаў, якія лічылі, што гістарыяграфічны факт па сваёй функцыянальнай нагрузцы шырэй, чым гістарыяграфічная крыніца.

Таксама А. І. Зевелеў прывёў класіфікацыю, якая ўтрымлівала наступныя віды гістарыяграфічных крыніц: 1) работы гісторыкаў (кнігі і артыкулы); 2) дысертацыйныя даследаванні; 3) тэксты лекцыйных курсаў, частка якіх паслужыла асновай гістарыяграфічных даследаванняў; 4) чарнавікі неапублікаваных рукапісаў, карэктуры; 5) дзённікі, мемуары, аўтабіяграфіі, анкеты; 6) лісты; 7) вучэбныя праграмы і справаздачы па прачытаных курсах гістарыяграфіі; 8) матэрыялы перыядычнага і неперыядычнага друку (рэфератыўныя агляды, рэцэнзіі, бібліяграфічныя агляды, матэрыялы дыскусій); 9) матэрыялы работы канферэнцый, сімпозіўмаў і іншых форумаў па праблемах развіцця гістарычнай навукі, а таксама метадалогіі гістарыяграфіі; 10) масавыя крыніцы [2].

Як вынікае з дадзенай класіфікацыі, рэцэнзіі з’яўляюцца складовай часткай такой гістарыяграфічнай крыніцы, як “матэрыялы перыядычнага і неперыядычнага друку”, куды ўваходзяць рэфератыўныя агляды, рэцэнзіі,

бібліяграфічныя агляды, матэрыялы дыскусій. У другой палове XX ст. значэнне рэцэнзій для навуковай камунікацыі – прадмет вострых рознагалоссяў. У той час, як адны эксперты лічаць, што рэцэнзія ў якасці інструмента экспертызы становіцца ўсё менш адэкватная патрабаванням сучаснай навукі, для іншых яна застаецца адной з найважнейшых формаў навуковай (сама)крытыкі.

Якое месца займае рэцэнзаванне займае ў Беларусі? Аўтар не ставіў перад сабой задачу прааналізаваць *усе* рэцэнзіі, якія былі апублікаваны ў незалежнай Беларусі, але на канкрэтных рэцэнзіях паказаць становішча ў гэтым кірунку, выдзеліць асаблівасці дадзенага віда гістарыяграфічных крыніц. У дадзеным даследаванні для паспяховага вырашэння пастаўленых задач была выкарыстана відавая класіфікацыя рэцэнзій: на калектыўныя выданні, на манаграфіі асобных аўтараў, на зборнікі дакументаў, рэцэнзіі на замежныя выданні. Акрамя таго ўлічваліся колькасць рэцэнзій на тое ці іншае выданне, мова рэцэнзій, наяўнасць рэцэнзій на манаграфію не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

У 2011 г. у сувязі з 70-годдзем пачатку Вялікай Айчыннай вайны сумеснымі намаганнямі гісторыкаў Расіі, Беларусі і Украіны пачалася рэалізацыя праекта “Краіна ў агні”, вынікам якога з’явілася фундаментальнае трохтомнае выданне “Страна в огне” (тэматычныя нарысы і зборнікі дакументаў). Праца над праектам мае свае асаблівасці. Першы том “1941 год: Страна в огне” быў выдадзены ў 2011 г. Другі “Страна в огне: Коренной перелом. 1942–1943” і трэці “Страна в огне: в 3 т. Освобождение. 1944–1945” тамы ўбачылі свет толькі ў 2017 г. Такая затрымка ў значнай ступені выклікана сітуацыяй ва Украіне. Падзеі, якія адбыліся там, не толькі затрымалі выхад выдання, але і паўплывалі на склад аўтарскага калектыву, а таксама на структуру чарговага двухтомніка. Распачатую трохбаковую працу расійскіх, беларускіх і ўкраінскіх навукоўцаў працягнулі гісторыкі дзвюх дзяржаў – Расіі і Беларусі.

Трохтомнік выклікаў цікавасць навукоўцаў. На яго было падрыхтавана тры рэцэнзіі, у тым ліку і ў замежных выданнях. Першая рэцэнзія, напісаная С. Я. Новікавым у 2018 г. на першы том выдання, была змешчана ва ўкраінскім зборніку артыкулаў “Сторінки воєнної історії України” [3].

У адрозненне ад С. Я. Новікава, У. В. Здановіч выступіў рэцэнзентам усяго трохтомніка. У першай рэцэнзіі, змешчанай у расійскім часопісе “Журнал российских и восточноевропейских исторических исследований”, прааналізаваны падыходы расійскіх, беларускіх і украінскіх аўтараў да разглядаемых падзей, якія знайшлі адлюстраванне ў адпаведных раздзелах манаграфіі [4].

У другой рэцэнзіі, падрыхтаванай для акадэмічнага выдання “Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, вышэйадзначаны рэцэнзент у сціслай форме аналізуе часткі “Расія”, “Украіна”, засяродзіўшы асноўную ўвагу на нарысах, аўтарамі якіх з’яўляюцца супрацоўнікі Акадэміі навук Беларусі [5].

Важнай з’явай у беларускай гістарычнай навуцы стала падрыхтаваная вядомымі айчыннымі даследчыкамі калектыўная манаграфія «Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне», у якой упершыню абагульнены ўклад беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў разгром нацысцкай Германіі. Кніга напісана на падставе шырокага корпуса крыніц: апублікаваных матэрыялаў, у тым ліку гістарычнай літаратуры на замежных мовах, матэрыялаў друку, сведчанняў удзельнікаў і відавочцаў тых падзей. Асаблівую важкасць даследаванню надаюць архіўныя дакументы, значная колькасць якіх уводзіцца аўтарамі ў навуковы ўжытак упершыню. Грунтоўны аналіз манаграфіі ажыццёўлены У. В. Здановічам у артыкуле “Ратны, працоўны, духоўны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай айчыннай вайны: новыя здабыткі айчыннай гістарыяграфіі” [6].

Са змяненнем грамадска-палітычнай сітуацыі пасля распаду СССР з’явіліся новыя магчымасці для вывучэння акупацыйнага рэжыму і такой яго састаўной часткі, як выкарыстанне савецкіх грамадзянаў на прымусовых работах, у першую чаргу ў Трэцім рэйху. Прадметам навуковага даследавання ў айчыннай гістарыяграфіі стала палітыка прымусовай працы, што ажыццяўлялася германскімі акупацыйнымі ўладамі на тэрыторыі Беларусі. Асобнае месца ў шэрагу выдадзенай літаратуры займаюць падрыхтаваныя сумеснымі намаганнямі айчынных і нямецкіх навукоўцаў зборнік артыкулаў “Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)” і манаграфія “Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг.”

Дадзеныя працы сталі прадметам рэцэнзіі У. В. Здановіча, змешчанай у “Беларускім гістарычным часопісе” [7].

Беларускімі гісторыкамі падрыхтаваны рэцэнзіі і на манаграфіі асобных аўтараў. У перыяд акупацыі Беларусі частка насельніцтва прымусова ці добраахвотна пайшла на супрацоўніцтва з захопнікамі. Значны ўклад у распрацоўку праблемы калабарацыі ўнёс беларускі гісторык А. А. Каваленя, асноўным аб’ектам даследаванняў якога стала жыццё моладзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Як сведчаць архіўныя і апублікаваныя крыніцы, пераважная большасць юнакоў і дзяўчат Беларусі прынялі актыўны ўдзел у партызанскай і падпольнай барацьбе супраць захопнікаў. У параўнанні з гэтым колькасць прадстаўнікоў моладзі Беларусі, якая з розных прычын пайшла на супрацоўніцтва з ворагам і свядома выехала на працу ў Германію, была нязначнай. Вытокі, заснаванне, палітычная сутнасць і структура, колькасны склад, дзейнасць прагерманскіх саюзаў моладзі на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. раскрыты ў манаграфіі А. А. Кавалені “Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць”, якая ўбачыла свет у 1999 г. У 2001 г. у часопісе “Вестник МГЛУ” была змешчана рэцэнзія С. Я. Новікава на дадзенае выданне [8].

Напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі ўбачыла свет манаграфія С. Я. Новікава “Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў”. Кніга, метадалагічнай асновай якой стала гістарыягра-

фічная і крыніцазнаўчая кампаратывістыка – паказ баявых дзеянняў на падставе параўнальна-гістарычнага аналізу гістарыяграфічных і гістарычных крыніц, у першую чаргу дакументальных, савецкага і нямецкага паходжання, уносіць істотны ўклад у вывучэнне гісторыі абарончых баёў і праведзеных контрудараў Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Манаграфія выклікала вялікую цікавасць навуковай грамадскасці. Пацвярджэннем таму з'яўляюцца тры рэцэнзіі, падрыхтаваныя У. К. Коршукам [9], У. В. Здановічам [10] і сумесна С. П. Кубекам і А. Г. Цымбалам [11].

У 2019 г. убачыла свет кніга пра Гомельскую турму «"Хто можа перадайце родным…": Таямніцы турэмных камер акупаванага Гомеля (1941–1943)», падрыхтаваная вядомым не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі гісторыкам Вялікай Айчыннай вайны А. М. Літвіным. Гэта выданне з'яўляецца значным укладам у вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дазваляе на прыкладах канкрэтных людзей убачыць як гераічныя і трагічныя, так і цёмныя бакі ў іх паводзінах, усвядоміць суровую ваенную штодзённасць. Даследаванне не толькі па-новаму ставіць пытанні і праблемы гісторыі турэмных вязняў, але і служыць своеасаблівым дапаможнікам па арганізацыі працэсу пошуку звестак аб людзях, якія пакінулі свае надпісы на сценах турмаў. Менавіта такая ацэнка ўтрымліваецца ў падрыхаванай У. В. Здановічам рэцэнзіі [12].

Важнае месца сярод крыніц займаюць апублікаваныя дакументы і матэрыялы, якія дазваляюць не толькі паказаць крыніцавую базу даследавання праблемы, але і вызначыць канцэпцыі публікатараў, накіраванасць і ўзровень даследавання тэмы ў розныя перыяды. 4 мая 2017 г. у Брэсцкай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася прэзентацыя зборніка дакументаў "Брест в 1941–1944 гг. Оккупация. Документы и материалы", падрыхтаванага аўтарскім калектывам у складзе дацэнта кафедры ўсеагульнай гісторыі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Пушкіна Я. С. Разенблата і супрацоўнікаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці А. Г. Карапузавай і Г. Д. Калуставай. "Дадзенае выданне, – падкрэслівае ў рэцэнзіі У. В. Здановіч, – з'яўляецца значным укладам у вывучэнне маладаследаванага аспекту гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – гісторыі паўсядзённасці жыхароў беларускіх гарадоў, рабочых прамысловых прадпрыемстваў, служачых, а таксама жанчын, ваеннапалонных, вязняў гета, дзяцей на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг." [13, с. 41].

У 2016 г. сумеснымі намаганнямі беларускіх гісторыкаў Я. С. Разенблата, І. Э. Яленскай, А. І. Пашковіч, С. У. Струнца і дактаранта Лейпцыгскага ўніверсітэта К. Ганцэра (кіраўнік аўтарскага калектыву) падрыхтаваны зборнік "Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии", у якім на падставе сведчанняў савецкага (абаронцаў Брэсцкай крэпасці, членаў іх сямей, жыхароў Брэста, эвакуяваных партыйных работнікаў, вышэйшага савецкага ваеннага кіраўніцтва) і нямецкага (ваеннаслужачыя вермахта, паліцэйскія) бакоў паказана сітуацыя, якая склалася ў Брэсце і крэпасці ў першыя тыдні вайны. У 2017 г. з дапаўненнямі

і выпраўленнямі зборнік быў перавы-дадзены. Ён не застаўся незаўважаным навуковай супольнасцю Беларусі. Вядомы спецыяліст па нямецкіх дакументах С. Я. Новікаў падрыхтаваў тры рэцэнзіі на першае і другое выданне зборніка [14; 15; 16].

Неабходна адзначыць, што адным з першых спробу дакументальнага асвятлення абароны Брэсцкай крэпасці распачаў расійскі даследчык Р. Аліеў. У 2010 г. ім апублікаваны ў зборніку «Брэсцкая крэпасць. Успаміны і дакументы» 146 малавядомых нямецкіх дакументаў і ўспамінаў непасрэдных абаронцаў крэпасці [17]. Падбор дакументаў, іх археаграфічная апрацоўка выклікалі неадназначную адзнаку даследчыкаў. Так, беларускі гісторык С. Я. Новікаў, нягледзячы на асобныя нязначныя заўвагі, звязаныя ў асноўным са зробленымі да дакументаў каментарамі, даведкамі, у цэлым станоўча ацэньваючы выданне, адзначае, што “аналіз новай камбінаванай працы дае падставы для высокай ацэнкі зробленага калектыўнымі намаганнямі зборніка дакументаў і ўспамінаў... уведзеныя ў навуковы абарот новыя матэрыялы кардынальна мяняюць асобныя палажэнні, устаноўленыя ў беларускай гістарыяграфіі аб абароне Брэсцкай крэпасці” [18, с. 33].

У той жа час нямецкі даследчык К. Ганцэр у артыкуле “Спекуляцыі замест сур’ёзнага даследавання”, апублікаваным у часопісе “Архе”, піша: “Крыніцы выбраны па прынцыпе выпадковасці (тое, што напісана ад рукі Р. Аліеў не публікуе). Яны былі транскрыбаваны непрафесійна (відавочна часткова з дапамогай праграмы для распазнання тэксту), таму ў іх ёсць памылкі… Крытыка крыніц адсутнічае амаль цалкам, як і ўказанні крыніц у каментары. Праца такога роду, без публікацыі паказчыка асоб і населеных пунктаў сведчыць аб выключным непрафесіяналізме” [19, с. 172].

У 1990-я – пачатку 2000-х гг. перастала быць галоўным тэматычным блокам гісторыя партызанскага руху. Тым не менш дакументальнае асвятленне праблемы не спынілася. Сумеснымі намаганнямі супрацоўнікаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі быў падрыхтаваны зборнік «Партизаны в операции “Багратион”», які стаў працягам публікацыі дакументаў, прысвечаных партызанскаму руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, распачатай яшчэ ў 1960-я гг. У выданні прадстаўлены 200 малавядомых дакументаў і матэрыялаў,з якіх толькі 5 былі раней надрукаваны. Станоўчыя моманты і недахопы зборніка знайшлі адлюстраванне ў рэцэнзіі С. Я. Новікава [20].

Асобным відам рэцэнзій з’яўляюцца рэцэнзіі на замежныя выданні. У сувязі з тым, што большая частка беларускіх гісторыкаў Вялікай Айчыннай вайны не валодае нямецкай мовай, рэцэнзіі на творы нямецкіх аўтараў па сутнасці становяцца адзіным сродкам знаёмства навукоўцаў (і не толькі) з дасягненнямі і недахопамі германскай гістарыяграфіі. Несумненная пальма першынства ў гэтым кірунку належыць С. Я. Новікаву, які падрыхтаваў больш за 30 рэцэнзій на замежныя выданні. Для прыкладу возьмем рэцэнзію на працы нямецкіх аўтараў гісторыка А. Ангрыка і журналіста Е. Хофмана,

прысвечаныя дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр”, пачынаючы з лета 1943 г. «Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943–1944 гг.: да пытання аб дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр”». Адзначым, што ў айчыннай гістарыяграфіі адсутнічае спецыяльная праца аб дзейнасці дадзенага нацысцкага фарміравання, нягледзячы на тое, што зондэркаманда пакінула свой злачынны след не толькі ў раёне Трасцянца, але і ў Гомелі, Рагачове, Барысаве, Бабруйску, Магілёве, Оршы, Полацку, Віцебску, Крупках, Лепелі, Вілейцы, Гродне, Бярозе, Баранавічах, Іванаве, Кобрыне, Маладзечне, Міры, Пінску, Слоніме, Слуцку, Броннай гары.

У прыватнасці, у даследаванні А. Ангрыка цікавасць уяўляюць звесткі пра “каманду смяротнікаў” – рабочую каманду для выканання работ па адкрыцці пахаванняў, далейшай эксгумацыі і спальванні трупаў. Пасля заканчэння ўсіх работ рабочыя каманды падлягалі знішчэнню. Адзіным, каму ўдалося выратавацца і ўспаміны якога былі зафіксафаны, быў жыхар в. Прысна Магілёўскага раёна С. І. Пілуноў. Пражывалі рабочыя ў спецыяльна пабудаваных зямлянках, уваход куды быў “такім вузкім, каб праціснуцца мог адзін чалавек, што перасцерагала ад масавых уцёкаў. Начаваць вязні маглі толькі лежачы на баку адзін каля аднаго. У выпадку халоднага надвор’я прадугледжвалася ўстаноўка печы для ацяплення” [21, с. 9].

Для захавання інфармацыі аб дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр” выкарыстоўвалася шыфраваная перадача данных у імперскае ведамства бяспекі ў Берліне – “зводкі пра надвор’е”, “вырубка лесу” і іншае. Пад «звесткамі “*аб вышыні аблокаў*” мелася на ўвазе колькасць спаленых трупаў, а пад “*ападкамі*” – колькасць задзейнічаных у работах каманды мясцовых вязняў, якія падлягалі ліквідацыі» [21, с. 6, 7].

Аўтару падрыхтаванай на падставе дакументаў пасляваенных судовых працэсаў і паліцэйскіх допытаў былых супрацоўнікаў “зондэркаманды 1005-Цэнтр” кнігі Е. Хофману «ўдалося паказаць малавядомыя старонкі гісторыі паўсядзённасці на тэрыторыі працоўнага лагера, які быў размешчаны побач з вёскай Малы Трасцянец, пры гэтым назваць імёны тых, хто знаходзіўся ў “камандзе смяротнікаў”, каму пашчасціла застацца ў жывых і стаць сведкам жахлівых старонак гісторыі лагера смерці пад Мінскам… Апошнім сюжэтам, якім Е. Хофман завяршае разгляд дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр” на тэрыторыі Беларусі, з’яўляецца ліквідацыя слядоў нацысцкіх злачынстваў у Слоніме і яго ваколіцах» [21, с. 10, 12].

Праведзены аналіз сведчыць, што ў беларускай гістарыяграфіі маюцца пэўныя здабыткі ў гэтым кірунку. У прадстаўленых рэцэнзіях даецца аналітычны агляд навуковай працы, вызначаецца, наколькі манаграфія прадстаўляе новыя ідэі і падыходы да вывучаемай тэмы, ацэньваецца ўнёсак аўтара ў развіццё навуковых ведаў па тэме даследавання. Разам з тым, у адрозненне ад 1960-х–1970-х гг., калі рэцэнзіі вылучаліся разнастайнасцю стылю і індывідуальнасцю выкладання, асабліва калі яны супадалі з навуковымі інтарэсамі аўтара рэцэнзаванага выдання, на дадзеным этапе рэцэнзаванне знаходзіцца

ў стане крызісу жанру. Нават у найбольш буйных гістарычных часопісах раздзел рэцэнзій невялікі. У гэтай сувязі значная частка навуковых прац, якія выходзяць як у нашай краіне, так і за мяжой, у тым ліку ў краінах СНД, наогул не рэцэнзуецца, і многія наватарскія і дыскусійныя даследаванні часта застаюцца незаўважанымі. На жаль, рэцэнзіі не сталі адпраўной кропкай навуковай дыскусіі ў сувязі з тым, што аўтары практычна не прадстаўляюць водгукі ў адказ на крытычныя рэцэнзіі.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Зевелев, А. И.* Историографическое исследование: методологические аспекты / А. И. Зевелев // Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки : межвуз. темат. сб. – Калинин : Калинин. гос. ун-т, 1980. – С. 119.
2. *Зевелев, А. И.* Историографическое исследование: методологические аспекты / А. И. Зевелев // Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки : межвуз. темат. сб. – Калинин : Калинин. гос. ун-т, 1980. – С. 127–131.
3. *Новиков, С. Е.* Боевые действия Красной армии летом 1941 года в отражении национальных историографий и новейших источников/ С. Е. Новиков //Сторінки воєнної історії України : зб. наук. ст. / відп. ред. О. Є. Лисенко. – К. : Ін. історії України НАН України, 2018. – Вип. 20. – 294 с. – С. 121–153.
4. *Зданович, В.* Страна в огне. 1941–1945: достижения современной историографии / В. Зданович // Журнал российских и восточноевропейских исторических исследований. – 2018. – № 3. – С. 164–187.
5. *Здановіч, У. В.* Вялікая Айчынная вайна ў святле новых гістарычных крыніц / У. В. Здановіч // Весн. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2019. – № 2. – С. 242–250.
6. *Здановіч, У. В.* Ратны, працоўны, духоўны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай айчыннай вайны: новыя здабыткі айчыннай гістарыяграфіі / У. В. Здановіч // Изв. Нац. акад. наук Беларуси. – 2016. – № 2. – С.111–115.
7. *Здановіч, У. В.* Прымусовая праца насельніцтва Беларусі ў 1941–1945 гг.: новыя здабыткі айчыннай гістарыяграфіі / У. В. Здановіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 6. – С. 28–33.
8. *Новікаў, С. Я.* // У пошуку гістарычнай ісціны: новы навуковы погляд на моладзь гадоў вайны / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3, История, Философия, Социология, Экономика, Культурология. – 2001. – № 2. – С. 180–184. – Рэц. на кн.: Каваленя А. А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць / А. А. Каваленя. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1999. – 260 с
9. *Коршук, У. К.* Вялікая Айчынная вайна : погляд з розных бакоў / У. К. Коршук // Беларуская думка. – 2014. – № 10. – С. 94–96.

10. *Здановіч, У. В.* Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. у святле новых дакументальных крыніц / У. В. Здановіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 12 . – С. 23–27.

11. *Кубека, С. П.* Новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў у Беларусі летам 1941 года / С. П. Кубека, А. Г. Цымбал // Вестн. МГЛУ. Сер. 2, История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2014. – № 13. – С. 121–129.

12. *Здановичъ, В. В.* [Рецензия] / В. В. Зданович // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 11. – С. 35–38. – Рец. на книгу : А. М. Литвин. «Кто может передайте родным…» : тайны тюремных камер оккупированного Гомеля (1941–1943).

13. *Здановіч, У. В.* Брэст у перыяд нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.) у святле новых дакументаў / У. В. Здановіч // Беларускі гістарычны часопіс. – № 9. – 2017. – С. 36–41.

14. *Новікаў, С. Я.* Новыя факты і ацэнкі па гісторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці летам 1941 года / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 5. – С. 38–47. – Рэц. на кн.: Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – 723 с.

15. *Новікаў, С. Я.* Гісторыя баёў у Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. у сучасным нямецкім навуковым наратыве / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3, История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2022. – № 3. – С. 170–172. – Рэц. на кн.: Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – 2-е изд, испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.

16. *Новікаў, С. Я.* Барацьба за Брэсцкую крэпасць 1941. Падзея – Наратыў – Месца памяці / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычных часопіс. – 2023. – № 5. – С. 11–16. – Рэц. на кн.: Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – 2-е изд. испр. – Смоленск : Инбелкульт, 2017. – 728 с.

17. *Аліеў, Р.* Брэсцкая крэпасць. Успаміны і дакументы / Р. Аліеў. – М. : Веча, 2010. – 488 с.

18. *Новікаў, С. Я.* Брэсцкая крэпасць у дакументах і ўспамінах / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 6. – С. 27 – 33.

19. *Ганцэр, К.* Спекуляцыі замест сур’ёнага д аследавання / К. Ганцэр // Архе, – 2011. – № 11. – С. 162–172.

20. *Новікаў, С. Я.* // Беларускія партызаны ў аперацыі “Баграціён” / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 8. – С. 4–12. – Рэц. на кн.: Партизаны в операции «Багратион»: документы и материалы / сост.: Н. А. Денисова [и др.] ; ред. кол. В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : Нац. библиотека Беларуси, 2014. – 412 с.

21. *Новікаў, С. Я.* Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943–1944 гг.: да пытання аб дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр” / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс – 2019. – № 5. – С. 3–13.